View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

brought to you by CORE

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Філалагічны факультэт
Кафедра беларускай літаратуры і культуры

# Гісторыя беларускай літаратуры

## Частка 1: 40—80-я гг. ХХ стагоддзя

Вучэбна-метадычныя матэрыялы
**для студэнтаў IV курса спецыяльнасці**
**1-21 05 01 Беларуская філалогія**

**Мінск**
**БДУ**
**2007**

УДК
ББК
Г

С к л а д а л ь н і к

докт. філал. навук, прафесар **А. І. Бельскі**

Зацверджана навукова-метадычным саветам філалагічнага факультэта БДУ (пратакол № ад 2006 г.)

Г **Гісторыя** беларускай літаратуры: Частка 1: 40—80-я гг. XX стагоддзя: вучэб.-метад. матэрыялы для студ. IV курса спец. Д 21 05 01 “Беларус. філалогія” / скл. А. І. Бельскі. — Мінск: БДУ, 2007. — с.

Вучэбна-метадычны комплекс уключае разнастайныя матэрыялы па курсе беларускай літаратуры XX стагоддзя: ад часу Вялікай Айчыннай вайны да сярэдзіны 80-х гг.

Адрасуецца студэнтам філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, а таксама можа быць выкарыстана ў іншых вышэйшых навучальных установах, дзе сістэматычна вывучаецца курс гісторыі беларускай літаратуры.

**УДК**
**ББК**

Ó **Бельскі А. І., складанне, 2007**

## Агульныя заўвагі і метадычныя парады

Вучэбна-метадычную распрацоўку складаюць разнастайныя матэрыялы па лекцыйным курсе гісторыі беларускай літаратуры, які ахоплівае 40—80-я гг. XX стагоддзя і чытаецца студэнтам IV курса дзённай формы навучання філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Курс разлічаны на 28 лекцыйных гадзін, 12 гадзін адведзена на практычныя заняткі. Адпаведная колькасць гадзін запланавана на іншыя віды навучальнай дзейнасці: напісанне рэфератаў, самастойная работа студэнтаў (КСР), індывідуальныя кансультацыі. На працягу семестра ажыццяўляюцца розныя формы і віды кантролю за самападрыхтоўкай студэнтаў: калёквіумы (гутарка выкладчыка са студэнтамі з мэтай выяўлення іх ведаў); мікразалікі па пэўных тэмах; тэставыя заданні; праверка канспектаў.

У аснову навучання пакладзена рэйтынгавая сістэма, г. зн. кожны са студэнтаў можа набраць пэўны індывідуальны лікавы каэфіцыент ацэнкі навучальнай дзейнасці. Рэйтынг выводзіцца паводле вынікаў пісьмовых работ (творчых заданняў, рэфератаў і інш.), мікразалікаў, уліку наведвання лекцый, працы на практычных занятках і іншых паказальнікаў.

Выкладанне курса літаратуры, самастойная навукова-пошукавая дзейнасць студэнтаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з тыпавой праграмай[1], а таксама з улікам спецыфікі вучэбна-метадычнай працы ў канкрэтнай навучальнай установе. Праграма ўключае падрабязную анатацыю кожнай вывучаемай тэмы, уключае грунтоўны спіс навуковай літаратуры (асноўная і дадатковая), пералік асноўных крыніц мастацкіх тэкстаў.

У спісе навуковай літаратуры найперш пададзены аўтарскія працы лектара. Асноўная крыніца для самападрыхтоўкі — акадэмічная "Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя" (Т. 2, 3; 4, кн. 1, 2). Спіс уключае таксама іншыя навуковыя крыніцы. У першую чаргу неабходна карыстацца падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі. Важна навучыцца самастойна весці пошук патрэбнай літаратуры ў бібліятэках. Шмат матэрыялаў, якія могуць быць запатрабаваны ў працэсе самападрыхтоўкі, змешчаны ў часопісах "Роднае слова", "Беларуская мова і літаратура", "Полымя", "Маладосць", "Крыніца", штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва".

На практычных занятках у цэнтры ўвагі будзе разгляд творчасці У. Караткевіча. Неабходна ўсвядоміць ролю і значэнне пісьменніка ў гісторыі беларускай літаратуры і культуры, паказаць наватарскі характар яго творчасці, глыбіню яго мастацка-філасофскай думкі. Вельмі важна выявіць патрыятычную, маральна-этычную і гуманістычную змястоўнасць паэзіі і прозы У. Караткевіча, высветліць пытанні, якія тычацца творчага метаду пісьменніка, спецыфікі гістарызму ў яго творах. У ходзе заняткаў дамінуючым павінен быць філалагічны аналіз тэксту. Таму асаблівае значэнне неабходна надаць пісьменніцкаму майстэрству, аўтарскаму стылю і мове, паэтыцы канкрэтных твораў.

У мэтах кантролю за самастойнай працай студэнтаў прадугледжаны розныя віды і формы заданняў: рэфераты, тэставыя заданні і інш. У гэтай метадычнай распрацоўцы

[1] Гісторыя беларускай літаратуры XX — пачатку XXI стагоддзя: вучэб. праграма для ВНУ па спец. 1-21 05 01 Беларус. філалогія, 1-21 05 02 Руская філалогія, 1-21 05 04 Славянская філалогія, 1-21 05 06 Рамана-германская філалогія / пад навук. рэд. праф. Т. І. Шамякінай і праф. А. І. Бельскага. — Мінск: РІВШ, 2006. — 168 с.

змешчана прыкладная тэматыка рэфератаў, узор тэставага задання, а таксама спіс пытанняў да экзамену. Гэта зроблена дзеля таго, каб пазначыць арыенціры і шляхі ў індывідуальнай самастойнай падрыхтоўцы студэнтаў.

Прапанаваная метадычная распрацоўка разам з аўтарскімі працамі лектара ўяўляе сабой вучэбна-метадычны комплекс, які мае на мэце забяспечыць вывучэнне студэнтамі IV курса філфака БДУ гісторыі беларускай літаратуры: ад часу Вялікай Айчыннай вайны да сярэдзіны 80-х гг.

## Спіс мастацкіх тэкстаў

**Міхась Лынькоў.** Апавяданні “Гой”, “Над Бугам”, “Васількі”, “Дзіцячы башмачок” і інш. (5—6 твораў); аповесць “Міколка-паравоз”; раман Векапомныя дні” (урыўкі).

**Янка Брыль**. 4-5 апавяданняў, напісаных пасля 1955 г.: “Маці”, “Гуртавое”, “Шчопцямі і пудамі”, “Шаснаццаты” і інш. (на выбар); аповесць “Ніжнія Байдуны” (абавязкова); 20—25 мініяцюр з кніг “Жменя сонечных промняў”, “Вітраж”, “Сёння і памяць”, “Вячэрняе”, “Пішу як жыву” і інш. (кнігі і творы на выбар).

**Іван Мележ.** Апавяданні “У завіруху”, “У гарах дажджы” і інш. (2-3 творы); раманы “Людзі на балоце”, “Подых навальніцы” (абавязкова), “Завеі, снежань” (скарочана).

**Пятрусь Броўка.** Вершы са зб. “Пахне чабор”, “А дні ідуць”, “Між чырвоных рабін”, “Калі ласка” і інш.: “Александрына”, “Як ліст дубовы”, “Пахне чабор”, “Аб сумленні”, “Дабро”, “Журавы”, “Калі надыдзе час спачыну…” і інш. — 8—10 вершаў; паэмы “Беларусь”, “Голас сэрца” // Броўка П. Зб. тв. : у 9 т. — Мінск, 1987—1992.

**Аркадзь Куляшоў.** Лірыка са зб. “Росквіт зямлі”, “Медзі дождж”, “У зялёнай дуброве”, “Новая кніга”, “Сасна і бяроза”, “Хуткасць”: “Як дзень адыходзіць…”, “Восень”, “Бывай…”, “Ліст з палону”, Зямля”, “Ты і я”, “Пра вечнае пяро”, “Ёсць у паэта свой аблог цалінны…”, “Нябёсы — акіян, я знаў даўно…”, “Стаю і з пачуццём неўтаймаваным…”, “Мне кожны год, нібы жыццём другім…” і інш. — 15—20 вершаў); паэмы, “Цунамі”, “Варшаўскі шлях”, “Кастусь Каліноўскі” // Куляшоў А. Зб. тв. : у 5 т. — Мінск, 1974—1977.

**Пімен Панчанка.** Творы са зб. “Упэўненасць”,“Кніга вандраванняў і любові”, “Нью-Йорскія малюнкі”, “Снежань”, “Крык сойкі”, “Дзе начуе жаўранак”, “Лясныя воблакі”, “І вера, і вернасць, і вечнасць”, “Горкі жолуд”, “Высокі бераг” і інш.: “Краіна мая”, “Зубр”, Сінія касачы”, “Курганы”, “Прыстасаванцы”, “Рабінавы гай”, “Родная мова”, ”Лясныя воблакі”, “Мы з тых беларусаў”, “Любімыя радкі”, “Ля жыта”, “Ратуйце нашы душы!”, “Калі мы губляем час”, “Аб самым смачным…”, “Беларускія настаўніцы” і інш. (15—20 вершаў, абавязкова); “Паэма сораму і гневу”; дзённік П. Панчанкі (Полымя. — 1998. — № 5 і інш. (па жаданні).

**Максім Танк.** Творы са зб. “Каб ведалі”, “На камні, жалезе і золаце”, “У дарозе”, “Мой хлеб надзённы”, “Дарога, закалыханая жытам”, “Прайсці праз вернасць”, “За маім сталом”, “Збор калосся”, “Мой каўчэг”, “Errata” і інш. (15—20 вершаў на выбар).

**Уладзімір Караткевіч.** 10—12 вершаў са зб. “Вячэрнія ветразі”, “Мая Іліяда”. Зборнік паэзіі “Быў. Ёсць. Буду.”. Аповесць “Чазенія”. 2-3 творы на выбар: “Сівая легенда”, “Цыганскі кароль”, “Ладдзя Роспачы”, апавяданні “Блакіт і золата дня”, “Сінія-сіняя”, Кніганошы” і інш. На выбар: “Дзікае паляванне караля Стаха” або “Чорны замак Альшанскі”. Раман “Каласы пад сярпом тваім” (абавязкова).

**Андрэй Макаёнак.** П’есы “Зацюканы апостал”, “Трыбунал”, “Верачка”, “Пагарэльцы”.

**Янка Маўр.** “Чалавек ідзе”, “У краіне райскай птушкі”, “Сын вады”, “Амок”, “Палескія рабінзоны”, “Фантамабіль прафесара Цылякоўскага” (тры творы на выбар).

**Аляксей Кулакоўскі.** Аповесці “Нявестка” або “Дабрасельцы”.

**Аляксей Пысін.** 15—20 вершаў са “Збору твораў” (Т. 1, 1989).

**Паэзія. Кнігі і творы (на выбар 3-4 аўтары):** М. Аўрамчыка, С. Грахоўскага, М. Лужаніна, А. Бачылы, К. Кірэенкі, Е. Лось, А. Грачанікава, Ю. Свіркі, В. Зуёнка, В. Вярбы і інш.

**Проза. Творы (на выбар 3-4 аўтары):** А. Асіпенкі, А. Карпюка, І. Пташнікава, У. Дамашэвіча, Ф. Янкоўскага, Б. Сачанкі, А. Кудраўца, А. Васілевіч, Г. Марчука, У. Рубанава і інш.

**Драматургія. Творы (на выбар 3-4 аўтары):** К. Губарэвіча, А. Маўзона, А. Петрашкевіча, М. Матукоўскага, А. Дзялендзіка і інш.

## Спіс навуковай літаратуры

### *Аўтарскія працы лектара*


1. **Бельскі А. І.** Літаратура другой паловы 50—60-х гадоў // **Беларуская літаратура: XI — XX стст. :** дапам. для шк., ліцэяў, гімназій, ВНУ /А. І. Бельскі, У. Г. Кароткі, П. І. Навуменка і інш. — 2-е выд. — Мінск, 2001. — С. 197—234.
2. **Бельскі А.** Сучасная літаратура Беларусі : дапам. для настаўнікаў. — Мінск, 2000.
3. **Бельскі А.** Краса і смутак : дапам. для настаўнікаў. — Мінск, 2000.
4. **Бельскі А.** Свет ад травы да зор: Сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу : дапам. для настаўнікаў. — Мінск, 1998.
5. **Бельскі А. І.** Беларуская літаратура XX стагоддзя: Гісторыя і сучаснасць. — Мінск, 2005.
6. **Бельскі А. І.** Класікі і сучаснікі ў школе. — Мінск, 2005.


### *Падручнікі, дапаможнікі, манаграфіі*


1. **Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя :** у 4 т. Т. 2, 3, 4 (кн. 1—2) / Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мінск, 2001, 2002, 2003.
2. **Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: у 2 ч**. / пад рэд. І. Я. Навуменкі, П. К. Дзюбайлы, Д. Я. Бугаёва. — Мінск, 1981—1982.
3. **Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: 1941—1980** / пад агул. рэд. М. А. Лазарука і А. А. Семяновіча. — Мінск, 1983.
4. **Адамовіч А.** Здалёк і зблізку. — Мінск, 1976.
5. **Андраюк С.** А жыццё — вышэй за ўсё. — Мінск, 1992.
6. **Бечык В.** Выбранае. — Мінск, 1989.
7. **Бечык В.** Шлях да акіяна. — Мінск, 1981.
8. **Бугаёў Д.** Арганічнасць таленту. — Мінск, 1989.
9. **Бугаёў Д.** Вернасць прызванню. Творчая індывідуальнасць І. Мележа. — Мінск, 1977.
10. **Бугаёў Д.** Паэзія Максіма Танка. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мінск, 2003.
11. **Бугаёў Д. Я.** Спавядальнае слова : літ. крытыка, успаміны. — Мінск, 2001.
12. **Бярозкін Р.** Паэзія — маё жыццё : літ.-крытыч. арт. — Мінск, 1989.
13. **Васючэнка П.** Драматургія і час. — Мінск, 1991.
14. **Васючэнка П.** Пошукі страчанага дзяцінства: Беларус. празаікі “сярэд. пакалення” аб Вялікай Айчыннай вайне. — Мінск, 1995.
15. **Верабей А.** Уладзімір Караткевіч: Жыццё і творчасць. — Мінск, 2005.
16. **Гарадніцкі Я.** А. Думка і вобраз: Праблема інтэлектуалізму ў сучас. белус. лірыцы. — Мінск, 1986.
17. **Гніламёдаў У.** Сучасная беларуская паэзія. — Мінск, 1983.
18. **Гніламёдаў У.** Ля аднаго вогнішча. — Мінск, 1984.
19. **Грамадчанка Т. К.** Перад праўдай высокай і вечнай: Беларус. проза сёння. — Мінск, 1991.
20. **Дасаева Т. М.** Паэтыка лірызму ў беларускай прозе. — Мінск, 2001.
21. **Дзюбайла П.** Панарама сучаснай беларускай прозы. — Мінск, 1986.
22. **Дзюбайла П.** Станоўчы герой у беларускай літаратуры. — Мінск, 1990.
23. **Каваленка В.** Веліч праўды : выбр. — Мінск, 1989.
24. **Калеснік У.** Янка Брыль. — Мінск, 1990.

**25. Лаўшук С.** Сучасная беларуская драматургія. — Мінск, 1977.
**26. Лойка А.** Паэзія і час : літ.-крытыч. арт. — Мінск, 1981.
**27. Матрунёнак А. П.** Псіхалагічны аналіз у сучасным беларускім рамане. — Мінск, 1972.
**28. Мікуліч М.** На скрыжаваннях стагоддзя [Максім Танк]. — Мінск, 2000.
**29. Мішчанчук М. І., Шпакоўскі І. С.** Беларуская літаратура XX ст. : вучэб. дапам. — Мінск, 2001.
**30. Мішчанчук М. І.** Ёсць у паэта свой аблог цалінны: Жанрава-стылявая разнастайнасць сучас. беларус. лірыкі. — Мінск, 1992
**31. Мушынскі М. І.** І нічога, апроч праўды. — Мінск, 1990.
**32. Рагуля А.** Імгненні… — Мінск, 1990.
**33. Семяновіч А. А.** Гісторыя беларускай савецкай драматургі: 1917—1955 гг. — Мінск, 1987.
**34. Станюта А.** Плошча Свабоды. — Мінск, 1991.
**35. Сямёнава А.** Слова сапраўднага лад. — Мінск, 1987.
**36. Тычина М.** Народ и война. — Мінск, 1985.
**37. Тычына М.** Час прозы. — Мінск, 1983.
**38. Чабан Т. К.** Крылы рамантыкі: Рамантыч. тэндэнцыі ў сучас. беларус. паэзіі. — Мінск, 1982.
**39. Шкраба Р.** Моваю вобразаў. — Мінск, 1989.
**40. Шупенька Г.** Галоўнае — талент. — Мінск, 1989.
**41. Ярош М.** Пятрусь Броўка. — Мінск, 1981.
**42. Яфімава М.** Цэлы свет — дзецям: творч. партрэт Я. Маўра. — Мінск, 1983.

## Тэматыка лекцый

1. Уводзіны. Літаратура часу Вялікай Айчыннай вайны: антыфашысцкая скіраванасць, патрыятычны пафас, гераічнае і трагічнае. Пісьменнікі і іх лёсы.
2. Творчасць беларускіх паэтаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (аўтары і творы на выбар).
3. Развіццё беларускай літаратуры ў пасляваеннае дзесяцігоддзе (1945—1955 гг.). Агульная характарыстыка.
4. Беларуская літаратура другой паловы 50-х — 80-х гг.: канцэпуальная характарыстыка.
5. Беларуская паэзія 50—80-х гг. Агляд.
6. Беларуская проза 50—80-х гг.: традыцыйнае і наватарскае, жанрава-стылёвая разнастайнасць.
7. Беларуская драматургія: ад 50-х гг. да сучаснасці. Агляд.
8. Творчасць Аркадзя Куляшова.
9. Творчая індывідуальнасць П. Броўкі.
10. Жыццё і паэзія Максіма Танка.
11. Проза Міхася Лынькова.
12. Вехі біяграфіі і мастацкі свет. І. Мележа.
13. Паэзія П. Панчанкі: этапы творчай эвалюцыі.
14. Творчы шлях Янкі Брыля.
15. Шматграннасць творчай асобы У. Караткевіча.
16. Творчасць А. Макаёнка.
17. Янка Маўр — дзіцячы пісьменнік.

## Тэматыка практычных заняткаў

## Жыццё і творчасць Уладзіміра Караткевіча

***Уладзімір Караткевіч.*** 10—12 вершаў са зб. “Вячэрнія ветразі”, “Мая Іліяда”. Зборнік паэзіі “Быў. Ёсць. Буду.”. Аповесць “Чазенія”. 2—3 творы на выбар: “Сівая легенда”, “Цыганскі кароль”, “Ладдзя Роспачы”, апавяданні “Блакіт і золата дня”, “Сінія-сіняя”, Кніганошы” і інш. На выбар: “Дзікае паляванне караля Стаха” або “Чорны замак Альшанскі”. Раман “Каласы пад сярпом тваім” (абавязкова).

1. Біяграфія У. Караткевіча.
2. Паэзія У. Караткевіча: спецыфіка мастацкага светаадчування, жанравая разнастайнасць, асноўныя тэмы і вобразы, экспрэсіўнасць і эмацыянальнасць яго мовы.
3. Паэтызацыя чалавечых узаемаадносінаў у аповесці У. Караткевіча “Чазенія”. Пісьменнік як майстар пейзажу.
4. У. Караткевіч — класік беларускай гістарычнай прозы.

а) Адметнасць тэматыкі і стылістыкі апавяданняў У. Караткевіча “Кніганошы”, “Сіняя-сіняя” і інш.

б) Патрыятычны змест аповесці “Сівая легенда”. Нацыянальны характар у аповесці “Ладдзя Роспачы”.

в) Гістарычны дэтэктыў у творчасці пісьменніка. Адметнасць кампазіцыі, праблематыка аднаго з гісторыка-дэтэктыўных твораў (“Дзікае паляванне караля Стаха” або “Чорны замак Альшанскі”).

д) Раман “Каласы пад сярпом тваім”: мастацкае асэнсаванне народнага жыцця, нацыянальна-вызваленчай барацьбы, рэальныя гістарычныя асобы, прадстаўнікі дваранства, вобраз Алеся Загорскага, грунтоўнасць гістарычнага мыслення пісьменніка, яго псіхалагічнае майстэрства, спалучэнне гістарычнага і гісторыка-легендарнага, рамантычнага і рэалістычнага.

### Асноўная літаратура


1. *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя:* у 4 т. Т. 4. Кн. 1 / Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мінск, 2002. — С. 361—390.
2. *Верабей А.* Абуджаная памяць: Нарыс жыцця і творчасці. — Мінск, 1997.
3. *Верабей А.* Уладзімір Караткевіч: Жыццё і творчасць. — 2-е выд., дапрац. і выпраўл. — Мінск, 2005.
4. *Ішчанка Г. М.* Уладзімір Караткевіч у школе : дапам. для наст. — Мінск, 2002.
5. *Мальдзіс А.* Жыцце і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча. — Мінск, 1990.
6. *Русецкі А.* Уладзімір Караткевіч: Праз гісторыю ў сучаснасць. — Мінск, 1991, 2000.
7. *Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду!* : успаміны, інтэрв’ю, эсэ. — Мінск, 2005.
8. *Уладзімір Караткевіч і яго творчасць* у еўрапейскім культурным кантэксце : навук. зб. — Мінск, 2000.
9. *Шынкарэнка В. К.* Пад ветразем дабра і прыгажосці: Жанрава-стылявыя асаблівасці прозы У. Караткевіча. — Мінск, 1995.


## Пытанні для самападрыхтоўкі (КСР)

## Творчасць Янкі Брыля

***Янка Брыль.*** 4—5 апавяданняў, напісаных пасля 1955 г.: “Маці”, “Гуртавое”, “Шчопцямі і пудамі”, “Шаснаццаты” і інш. (на выбар); аповесць “Ніжнія Байдуны” (абавязкова); 20—25 мініяцюр з кніг “Жменя сонечных промняў”, “Вітраж”, “Сёння і памяць”, “Вячэрняе”, “Пішу як жыву”, “Дзе скарб ваш”, і інш. (кнігі і творы на выбар).

1. Асноўныя звесткі пра жыццё і творчасць Я. Брыля.
2. Янка Брыль — майстар апавядання: аўтарскі псіхалагізм, ёмістасць мастацкай дэталі, пластычнасць малюнкаў, яркасць выяўленчых сродкаў, лірызм, іншыя рысы індывідуальнага стылю пісьменніка (на матэрыяле прачытаных твораў).
3. Сутнасць лірыка-філасофскай прозы Я. Брыля. Брылёўская лірычная мініяцюра: тэматычная разнастайнасць, эстэтычная адметнасць (лаканізм і глыбіня думкі, шчырасць і непасрэднасць уражанняў, афарыстычнасць і інш.).
4. Гумар і іронія ў творчасці Я. Брыля. Прырода смеху і яго разнавіднасці ў аповесці “Ніжнія Байдуны”. Адметнасць вобразаў і мастацкай тыпізацыі.. Прыёмы стварэння камічнага эфекту ў аповесці: парадаксальнае сутыкненне фактаў і падзей, сродкі “карнавалізацыі”, гульня слоў, анекдатычнасць гісторый і сітуацый, інш.

### Асноўная літаратура


1. *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя :* у 4 т. — Т. 3. / Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мінск, 2001. — С. 479—520.
2. *Адамовіч А.* Здалёк і зблізку : зб. літ.-крытыч. арт. — Мінск, 1976. — С. 559—597.
3. *Бугаёў Д.* Спавядальнае слова : літ. крытыка, успаміны. — Мінск, 2001. — С. 28—57.
4. *Канэ Ю.* Як паветра і хлеб: Жыццёвы і творчы шлях Я. Брыля. — Мінск, 1988.
5. *Калеснік У.* Янка Брыль: Нарыс жыцця і творчасці. — Мінск, 1990.
6. *Ляшук В.* Вывучэнне творчасці Янкі Брыля ў школе. — Мінск, 2004.
7. *Стральцоў М.* Пячатка майстра : літ.-крытыч. арт., эсэ. — Мінск, 1986. — С. 66—77.
8. *Тычына М.* Змена квадры : літ.-крытыч. арт. — Мінск, 1983. — С. 55—67.
9. *Шкраба Р.* Моваю вобразаў : выбр. — Мінск, 1989. — С. 278—286.


### Крыніцы мастацкіх тэкстаў


**1.** **Брыль Я.** Выбраныя творы : у 3 т. — Мінск, 1992—1993.
**2.** **Брыль Я.** Запаветнае : выбр. тв. — Мінск, 1999.
**3.** **Брыль Я.** Збор твораў : у 5 т. — Мінск, 1979—1981.
**4.** **Брыль Я.** Вячэрняе. — Мінск, 1994.
**5.** **Брыль Я.** Пішу як жыву. — Мінск, 1994.
**6.** **Брыль Я.** Дзе скарб ваш. — Мінск, 1997.
**7.** **Брыль Я.** Сцежкі, дарогі, прастор. — Мінск, 2001.
**8.** **Брыль Я.** З людзьмі і сам-насам. — Мінск, 2003.
**9.** **Брыль Я.** Блакітны зніч. — Мінск, 2004.
**10.** **Брыль Я.** Парастак. — Мінск, 2006.

## Узор тэставага задання

1. Паразважайце на тэму “Творчая асоба Янкі Брыля і эпоха”. Акцэнтуйце пры гэтым увагу на тым, якія праблемы хвалююць пісьменніка.

2. Чаму Я. Брыль сказаў: “У мяне было два дзяцінствы”? Што ён меў на ўвазе?
а) Першыя пяць гадоў жыцця будучага пісьменніка прайшлі ў Адэсе, у 1922 г. разам з бацькамі ён пераехаў на іх радзіму ў Заходнюю Беларусь. Можна сказаць, што для яго пачалося другое, вясковае дзяцінства;
б) На дзіцячыя гады Я. Брыля прыпала грамадзянская вайна, жыццё ў Заходняй Беларусі, пазней ён стаў сведкам жахлівых падзей Вялікай Айчыннай вайны. У пісьменніка было два дзяцінствы — даваеннае і ваеннае.

3. Якія важныя падзеі адбыліся ў жыцці Я. Брыля ў 30—40-я гг.?
а) скончыў польскую сямігодку, пераехаў ў Мінск, працаваў рэдактарам газеты, удзельнічаў у антыфашысцкім падполлі, надрукаваў у часопісе “Полымя” першыя нарысы і апавяданні;
б) скончыў польскую сямігодку, у сакавіку 1939 г. прызваны ў польскую армію, ваяваў на фронце, трапіў у палон пад Гдыняй, удзельнічаў у партызанскім руху, працаваў у газеце-плакаце “Раздавім фашысцкую гадзіну”, часопісах “Вожык”, “Маладосць”, “Полымя”, выдаў кнігі “Апавяданні” і “Нёманскія казакі”;
в) скончыў польскую сямігодку, быў на фронце ў якасці ваеннага карэспандэнта, трапіў у палон, удзельнічаў у партызанскім руху, вызваляў Польшчу, працаваў у часопісах “Маладосць” і “Полымя”, выдаў зборнік “Апавяданні”.

4. Назавіце тыя літаратуры і пісьменнікаў, якія мелі істотны ўплыў на фарміраванне творчай асобы Я. Брыля?
а) польская, беларуская, чэшская ________________________________________;
б) руская, беларуская, польская __________________________________________;
в) беларуская, польская, англійская ______________________________________.

5. Якому герою Я. Брыля належаць наступныя словы: “А я ўпэўнены, маці, што вярнуся туды, дзе мой народ, і зраблю для яго, а праз яго — для ўсіх людзей усё, што змагу”?
а) Данік Малец. “Сірочы хлеб”;
б) Лёня Жывень. “Апошняя сустрэча”;
в) Алесь Руневіч. “Птушкі і гнёзды”;
г) Ігар Міхайлавіч. “Золак, убачаны здалёк”.

6. З кім у сааўтарстве Я. Брыль стварыў кнігу “Я з вогненнай вёскі…”(1975)?
а) А. Адамовічам, Д. Граніным;
б) А. Адамовічам, С. Алексіевіч;
в) А. Адамовічам, У. Калеснікам.
У чым унікальнасць гэтай кнігі? ________________________________________

7. Дайце характарыстыку аповесці “Ніжнія Байдуны”:
— жанравая адметнасць______________________;
— тэма, праблематыка ______________________;
— сістэма вобразаў __________________________;
— мастацка-стылёвыя адметнасці _______________;
— сэнс назвы _______________________________

— твор у беларускім і сусветным
літаратурным кантэксце ________________________

8. “Брыль — перш за ўсё лірык. Лірызм пранізвае ўсю тканіну твораў — вобразы, сюжэт, моўную стыхію”. Дакажыце гэта на прыкладах з твораў пісьменніка.

9. У якіх з ніжэйназваных зборнікаў Я. Брыля змешчаны лірычныя мініяцюры?
а) “Вераснёвая рунь”;
б) “Жменя сонечных промняў”;
в) “Сёння і памяць”;
г) “Надпіс на зрубе”;
д) “Пішу як жыву”;
ж) “Дзе скарб ваш”.

10. Што складае тэматычную і змястоўную аснову лірычных мініяцюр Я. Брыля? Як у іх выяўляецца філасафічнасць? Свой адказ абгрунтуйце.

## Творчыя заданні

1. Асноўныя жанры і іх развіццё ў літаратуры часу Вялікай Айчыннай вайны: пафас.
2. Лірыка беларускіх паэтаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
3. Зборнік А. Астрэйкі “Слуцкі пояс” як унікальная кніга часу вайны.
4. Апавяданні М. Лынькова 20—30-х гг.
5. Трагедыя вайны ў адлюстраванні М. Лынькова.
6. Вобразы дзяцей у прозе М. Лынькова.
7. Адлюстраванне вайны з фашызмам у творчасці Янкі Брыля.
8. Янка Брыль — майстар лірычнай мініяцюры.
9. Гумар у аповесці Я. Брыля “Ніжнія Байдуны”.
10. “Палеская хроніка” І. Мележа: жанр, праблематыка, багацце характараў.
11. Сацыяльныя і духоўныя праблемы жыцця беларускага сялянства ў “Палескай хроніцы” І. Мележа.
12. Станаўленне творчай індывідуальнасці П. Броўкі.
13. Паэтызацыя кахання ў лірыцы П. Броўкі.
14. Паэтычны эпас П. Броўкі (паэмы “Беларусь”, “Голас сэрца”).
15. Эвалюцыя лірыкі А. Куляшова.
16. Філасофская змястоўнасць паэтычнага эпасу А. Куляшова.
17. Патрыятычны пафас паэзіі Максіма Танка 30—40-х гг.
18. Верлібр і класічны верш у творчасці Максіма Танка.
19. Філасофскія матывы ў паэзіі Максіма Танка.
20. Паэзія П. Панчанкі. Этапы творчай эвалюцыі.
21. Гераічнае і трагічнае ў паэзіі П. Панчанкі часу вайны.
22. Выяўленне грамадзянскай пазіцыі і гуманістычнага светапогляду ў паэзіі П. Панчанкі.
23. Гістарычная тэма ў паэзіі У. Караткевіча.
24. Мастацкае асэнсаванне гісторыі ў прозе У. Караткевіча (творы на выбар).
25. Праблемы гісторыі і сучаснасці з адлюстраванні У. Караткевіча.
26. Сатырычная вастрыня камедый А. Макаёнка.
27. Спалучэнне камічнага і трагічнага ў п’есах А. Макаёнка.

28. Маральна-этычны змест п’ес А. Макаёнка “Зацюканы апостал” і “Пагарэльцы”.
29. Пазнавальнае і выхаваўчае значэнне твораў Янкі Маўра.
30. Роля Янкі Маўра ў развіцці беларускай дзіцячай літаратуры.
31. Жанрава-стылёвая разнастайнасць беларускай прозы 50—80-х гг. (А. Кулакоўскі, А. Карпюк, І. Пташнікаў, У. Дамашэвіч, Б. Сачанка, А. Кудравец, Г. Марчук і інш. — тры аўтары на выбар).
32. Сацыяльная і маральныя праблемы жыцця ў асэнсаванні А. Кулакоўскага.
33. Беларуская паэзія 50—80-х гг.: эвалюцыя і мастацкія набыткі.
34. Паэзія А. Пысіна.
35. Стан беларускай драматургіі ў 50—80-я гг.
36. Беларуская камедыя 50—80-х гг.: набыткі, праблемы развіцця.

## Пытанні да экзамену

1. Літаратура часу Вялікай Айчыннай вайны: антыфашысцкая скіраванасць, патрыятычны пафас, гераічнае і трагічнае. Пісьменнікі і іх лёсы.
2. Творчасць беларускіх паэтаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (аўтары і творы на выбар).
3. Развіццё беларускай літаратуры ў пасляваеннае дзесяцігоддзе (1945—1955 гг.). Агульная характарыстыка.
4. Беларуская літаратура 50-х — першай паловы 80-х гг.: заканамернасці і тэндэнцыі развіцця.
5. Эстэтычнае абнаўленне беларускай паэзіі другой паловы 50—60-х гг. Эвалюцыя вершаванага мастацтва ў 70—80-я гг.
6. Жанравае і тэматычнае развіццё беларускай прозы ў 60—80-я гг.
7. Беларуская вёска ў адлюстраванні беларускай мастацкай прозы 50—80-х гг.
8. Стан і праблемы развіцця беларускай драматургіі ў 50—80-я гг.
9. Творчасць А. Куляшова канца 20-х — 30-х гг. Паэма “Хлопцы апошняй вайны”.
10. Эвалюцыя лірыкі А. Куляшова. Наватарства “Новай кнігі” і яе значэнне для развіцця беларускай паэзіі.
11. Чалавек — зямля — сусвет у паэзіі А. Куляшова.
12. Філасафізм паэтычнага эпасу А. Куляшова (“Цунамі”, “Варшаўскі шлях”.)
13. Пейзажная лірыка П. Броўкі.
14. Лірыка П. Броўкі: трагедыйныя матывы ў творах ваеннага часу, глыбіня аўтарскага пачуцця, адбітак часу.
15. Духоўны свет лірычнага героя П. Броўкі ў паэзіі 50—70-х гг. Маральна-гуманістычная пазіцыя паэта.
16. Паэтычны эпас П. Броўкі (“Беларусь”, “Голас сэрца”).
17. Паэзія П. Панчанкі. Этапы творчай эвалюцыі.
18. Асноўныя вобразы і матывы ў ваеннай лірыцы П. Панчанкі.
19. Прырода і чалавек у паэзіі П. Панчанкі.
20. Адлюстраванне сучасных праблем у паэзіі П. Панчанкі другой паловы 80—90-х гг. Аўтарская пазіцыя, адметнасць стылю.
21. Ідэйна-мастацкая эвалюцыя творчасці Максіма Танка.
22. Творчасць Максіма Танка ў еўрапейскім літаратурным кантэксце.
23. Агляд творчасці М. Лынькова 20—30-х гг. Асаблівасці аўтарскага стылю.

24. Проза М. Лынькова пра вайну. Паказ трагедыі дзяцінства.
25. Ваеннае мінулае ў мастацкім паказе І. Мележа.
26. “Палеская хроніка” І. Мележа: наватарства, псіхалагічнае майстэрства, мова герояў і мова аўтара.
27. Свет Палесся і народныя характары ў “Палескай хроніцы” І. Мележа. Функцыі пейзажу.
28. Майстэрства Я. Брыля-апавядальніка (па апавяданнях Я. Брыля).
29. Тэматычная шматграннасць і эстэтычная арыгінальнасць лірычных мініяцюр Я. Брыля.
30. Аповесць Я. Брыля “Ніжнія Байдуны”. Прыём карнавалізацыі, сродкі стварэння камізму.
31. Ваенная тэма і філасофскія матывы ў паэзіі А. Пысіна.
32. Жанрава-стылёвая разнастайнасць беларускай паэзіі ў 50—80-я гг. (М. Аўрамчык, С. Грахоўскі, М. Лужанін, С. Гаўрусёў, Е. Лось, А. Грачанікаў і інш. — два-тры аўтары на выбар).
33. Праблемы сацыяльнага і духоўнага жыцця ў аповесцях А. Кулакоўскага “Нявестка” і “Дабрасельцы” (творы на выбар).
34. Шматграннасць творчай асобы У. Караткевіча.
35. Асноўныя тэмы і вобразы паэзіі У. Караткевіча. Кніга “Быў. Ёсць. Буду.”.
36. Паэтызацыя чалавечых узаемаадносінаў у аповесці У. Караткевіча “Чазенія”.
37. Адметнасць мастацкага стылю У. Караткевіча (аповесць “Сівая легенда” або Ладдзя Роспачы”, апавяданні — на выбар).
38. Гісторыка-дэтэктыўны жанр у творчасці У. Караткевіча (твор на выбар).
39. Раман У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”.
40. Агляд творчасці А. Макаёнка. Значэнне сатырычнай камедыі “Выбачайце, калі ласка” для развіцця беларускай драматургіі і тэатра.
41. П’есы А. Макаёнка “Зацюканы апостал” і “Трыбунал”. Мастацкая адметнасць твораў.
42. П’есы А. Макаёнка “Верачка” і “Пагарэльцы”. Жанравая спецыфіка твораў.
43. Сатыра і гумар у беларускай камедыі 50—80-х гг. (Кандрат Крапіва, М. Матукоўскі, А. Дзялендзік і інш. — два-тры аўтары на выбар).
44. Творчасць Янкі Маўра.

## Змест

**Агульныя заўвагі і метадычныя парады** ...........................................................

**Спіс мастацкіх тэкстаў** ..........................................................................

**Спіс навуковай літаратуры** ...................................................................

**Тэматыка лекцый** .................................................................................

**Тэматыка практычных заняткаў** .........................................................

**Пытанні для самападрыхтоўкі (КСР)** .................................................

**Узор тэставага задання** .........................................................................

**Тэматыка рэфератаў** ..............................................................................

**Пытанні да экзамену** ..............................................................................

*Вучэбнае выданне*

Гісторыя беларускай літаратуры

Частка 1: 40—80-я гг. XX стагоддзя

**Складальнік**

Бельскі Алесь Іванавіч

Адказны за выпуск *А. І. Бельскі*
Камп’ютэрны набор *А. І. Бельскі*
Рэдагаванне, карэктура, камп’ютэрная вёрстка *А. У. Бельская*

Падпісана да друку 00.00.2006. Формат 60х84/16.Папера афс. № 1.
Гарнітура Times New Roman. Друк афсетны.
Ум.-друк. арк. 0,00. Ул.-выд. арк. 0,00. Тыраж 50 экз. Заказ № .

Надрукавана на капіравальна-множальнай тэхніцы
філалагічнага факультэта.
220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31
Беларускі дзяржаўны універсітэт.
Ліцэнзія ЛІ № 02330/0056919 ад 01.04.2004.